Алесь Пісьмянкоў

Жывая Класіка Дзецям

# Бабчыны дранікі



«Мастацкая літаратура»

Жывая Класіка Дзецям

# АЛЕСЬ ПІСЬМЯНКОЎ

# БАБЧЫНЫ ДРАНІКІ



Вершы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2020

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-5
П35

Серыя заснавана ў 2017 годзе

Афармленне серыі *Надзеі Барай*

Укладальніца *Аксана Спрынчан*

Ілюстрацыі *Вольгі Дзятко*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**ISBN 978-985-02-1990-9**

© Пісьмянкова А. Р., Пісьмянкоў А. А.,
Пісьмянкоў М. А., 2020
© Спрынчан А. В., укладанне, 2020
© Дзятко В. М., ілюстрацыі, 2020
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2020

## МЫ — БЕЛАРУСЫ

А мы з братам беларусы,
Любім край свой родны.
Кажуць, продак быў наш русы,
Мужны і лагодны.

Быў ён сейбіт і араты,
Выстаяў у сечах.
Радавод складаем з татам
Мы амаль штовечар.

Пра яго пісаў Купала,
Калі зваў змагацца,
Продак наш зрабіў нямала,
Каб людзьмі нам звацца.



## ЗАЛАТОЕ СОНЕЙКА

Залатое сонейка
Выбегла на гонейкі.

І руплівая пчала
Дзень працоўны пачала.

Нават кот-вуркот і той
Ужо выпіў сырадой.

Што ж ты спіш усё, малы,
Што не вучышся ў пчалы?



## ЗАЙЦАЎ ХЛЕБ

У ляску-бярэзніку
Зай жыве гарэзлівы.
Зай вясёлы, зай вушасты,
З татам бачыцца ён часта.
І заўсёды пры сустрэчы
Ён дае нам хлеб заечы.
Хлеб заечы, хлеб не з крамы,
Самы-самы, самы-самы...

## ЯК БЫЦЬ?

Без марожанага
Гіну.
А з марожаным —
Ангіна.





## КОТ-МУШКЕЦЁР

Пацукбург — мышэй сталіца —
Стаў часцей ён Ваську сніцца.
Чуў калісьці ён ад дзеда,
Што там слаўныя абеды,
Але сам не быў ні разу —
Не хапае ў Ваські часу:
То мультфільмы, то камп'ютар,
То Барбос ганяе люты.

А было б, відаць, няблага
Адшукаць старую шпагу,
Ды ў мышыную сталіцу
Мушкецёрам заявіцца,
Пазнаёміцца з чароўнай
Каралеўнай Пацукоўнай.



## ЗАЎЗЯТАРЫ

Мы глядзім усе праграмы,
Мы — заўзятары «Дынама».
Мы за зборную таксама.
А настаўнік кажа мамам,
Што не ведаем праграмы.



## ГРЫБНІКІ

Я прачнуўся сёння
Рана
І цяпер буджу
Тумана.
Цэлы кош грыбоў
Крамяных
Назбіраем мы
З Туманам.
Грыб ён чуе
За вярсту.
Грыбніком і я
Расту.

## БАБЧЫНЫ ДРАНІКІ

Бабка ўстала раненька,
Да святла,
І гарачых дранікаў
Напякла.
Дранікаў-бульбянікаў —
Смакаты,
Дранікаў-бульбянікаў
Залатых:
  — Ешце, ешце, дзетачкі,
  Па талерцы поўненькай.
  Еш,
    унучка-кветачка,
  Еш,
    унучак-сонейка!





## ДОБРЫ ПЕВЕНЬ

Хоць свая ў яго сям'я,
Ён шкадуе вераб'я.
Накарміўшы ўсю сям'ю,
Кукарэкне вераб'ю:
«Ку-ка-рэ-ку!
Просім, просім...
Ку-ка-рэ-ку!
Проса, проса...»

## ЦЫМБАЛЫ

Без цымбалаў немагчыма
Уявіць зямлю — Айчыну,
Бо і ў радасці, і ў скрусе
Любяць іх на Беларусі:
Пад цымбалы,
Пад цымбалы
Тут
Лявоніха
Скакала!
А цяпер пад тыя ж гукі
Скачуць праўнукі і ўнукі.







## НА КАНЦЭРЦЕ

Дырыжор,
Нібыта жораў,
Узляціць вось-вось
Да зораў.
І аркестр
Рванецца з месца
За маэстра,
За маэстра...





## ПЕРШЫ СНЕГ

— Што, малы, так горка плачаш?
— Выпаў снег, а я — не бачыў!
Падаў снег, а я — прагледзеў!
Не праспаў зіму я ледзьве...
— Твае беды, брат, не беды,
Не рабі ты з іх трагедый:
У зімовай пушчы недзе
Зараз спяць усе мядзведзі...
— Але ж дзеці — не мядзведзі,
Нам цікава ўсё на свеце!



## АЗЯБЛАЯ МЯДЗВЕДЗІЦА

Азябла неба ад зімы,
Прылегла неба на дымы.
Вялікая Мядзведзіца
Ад радасці аж свеціцца:
На дзедавай хароміне
Прыгрэлася ля коміна.



## МАЛІНАВЫЯ СНЫ

Ні Алёшка, ні Максім
Не баяцца лютых зім.
Ад прастуды, ад ангіны
У іх ёсць збанок малінаў.
Мама кажа: «Да вясны
Ў нас малінавыя сны».





## ПРАЧЫНАЙСЯ, КОЦЯ-БРАЦЕ...

Прачынайся, коця-браце,
Ды хадзем грыбы збіраці.
На знаёмых росных сцежках
Нас чакаюць сыраежкі
(Не паблытай, як учора,
З ядавітым мухаморам!).
Вунь агністая лісічка
Падігліцай свеціць знічкай.
Побач з ёю тры сястрычкі,
Тры сястрычкі-невялічкі.
Што ж ты дрэмлеш, коця-браце,
Ранак тупае па хаце,
І трашчаць ужо сарокі,
Што мы соні-лежабокі.
На бярозавым узлеску
Баравік глядзіць з усмешкай.
Хоць з цябе амаль ён ростам,
А знайсці яго няпроста.
Пакідай жа цёплы ложак
Ды бяры лазовы кошык,
Свой наточаны сцізорык,
Сябра вернага Трызора...
Ты ж у нас не з лежабокаў —
Ты ж ужо расплюшчыў вока.



## РЫБАК

Наш Максім рыбак заўзяты,
Печкуроў лавіць аматар.
Для яго рыбалка — свята:
Чарвякоў капае... тата.

## ЧАМУ ВОЖЫК НЕ СТРЫЖЭЦЦА?

Вожык сцеражэцца
І зімой і летам.
Можа, й не стрыжэцца
Ён з нагоды гэтай,
Бо ў яго суседка
Ліска Лізаветка,
А ў хітрыцы ліскі
Воўк сваяк найблізкі.





## МІКОША

Кот Мікоша, кот Мікоша —
Ганарысты і прыгожы.
Ён і сёння стаць гатоў
Каралём усіх катоў.
У яго характар — кіпень,
У яго — жалезны кіпець,
Як зірне — адразу веру,
Што наш кот сваяк пантэры.



## НЕБА, ЛАСТАЎКІ І Я

Прагну свежасці і ветру,
Хай парушаць мой спакой,
Рэжце,
Ластаўкі,
Паветра
Над распаранай зямлёй.
Раскудлаць ты,
Вецер,
Грушу,
Усхвалюй і растрывож.
Ну наплач мне,
Неба,
Лужу,
Каб пабегчы басанож.

## Я НА МОРА НЕ ПАЕДУ

Я на мора
Не паеду,
А паеду
Лепш да дзеда.
Лепш
У дзеда Усёведа
Прагасцюю
Гэта лета:
Там
Любімы мой бярэзнік,
Там
Чакае Боб-гарэзнік,
Там
Кузьма — мой кот вучоны —
Лічыць
Лапкаю вагоны.





## ЗМЕСТ


Мы — беларусы ........ 3
Залатое сонейка ........ 4
Зайцаў хлеб ........ 5
Як быць? ........ 6
Кот-мушкецёр ........ 7
Заўзятары ........ 8
Грыбнікі ........ 9
Бабчыны дранікі ........ 10
Добры певень ........ 11
Цымбалы ........ 12
На канцэрце ........ 13
Першы снег ........ 14
Азяблая мядзведзіца ........ 15
Малінавыя сны ........ 16
Прачынайся, коця-браце... ........ 17
Рыбак ........ 18
Чаму вожык не стрыжэцца? ........ 19
Мікоша ........ 20
Неба, ластаўкі і я ........ 21
Я на мора не паеду ........ 22

Літаратурна-мастацкае выданне

ЖЫВАЯ КЛАСІКА ДЗЕЦЯМ

ПІСЬМЯНКОЎ Алесь (Аляксандр) Уладзіміравіч

БАБЧЫНЫ ДРАНІКІ

*Вершы*

Укладальніца *СПРЫНЧАН Аксана Вадзімаўна*

Рэдактар *А. В. Малішэўская*
Мастацкі рэдактар *В. І. Сенчанка*
Тэхнічны рэдактар *Л. І. Астрэйка*
Стылістычны рэдактар *А. М. Анцытовіч*

6+

Падпісана да друку 13.08.2020. Фармат $84 \times 100^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура TextBookC. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,34. Улік.-выд. арк. 2,30.
Тыраж 2000 экз. Заказ 853.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр-т Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Транстэкс».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/37 ад 29.01.2014.
Вул. Чапаева, 5, 220034, г. Мінск.

ISBN 978-985-02-1990-9

6+